Гродзенская праўда

30.11.2017

# Поўны збор твораў Скарыны прыехаў у Гродна. У бібліятэцы імя Я. Карскага прэзентавалі першае факсімільнае выданне кніжнай спадчыны першадрукара

Таццяна Мастоўская



***Сама ідэя, як распавёў дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Раман Матульскі, з'явілася яшчэ ў 2008 годзе. Праз пэўны час галоўнай кніжніцай краіны быў распрацаваны праект поўнага факсімільнага выдання кніжнай спадчыны нашага першадрукара. Была ідэя зраюбіць гэта без удзелу дзяржаўных сродкаў: калі перавыданне вартае і насамрэч патрэбна грамадскасці, яно абавязкова знойдзе падтрымку. У выніку праект падтрымала кіраўніцтва банка БелВЭБ і асабіста тагачасны старшыня праўлення банка Павел Калаур, які імгненна "загарэўся" ідэяй.***

Як і планавалася, праект завяршылі сёлета – у год святкавання 500-годдзя беларускага кнігадрукавання. Атрымаўся 20-томны збор – максімальная поўная спадчына Скарыны, арыгіналы кніг якога захоўваюцца ў розных краінах свету. Часам літаральна па старонцы навукоўцам даводзілася збіраць поўныя творы. У выніку ўпершыню ў гісторыі на адной паліцы стаяць кнігі, выдадзеныя нашым славутым першадрукаром і асветнікам.

Выданне папаўняе кніжніцы не толькі Беларусі, але і замежных краін. Ёсць яно ў бібліятэках Арганізацыі Аб'яднаных нацый, Ватыкана, Кітая і іншых краін. На Гродзеншчыну прыехала 29 камплектаў шматтомніка. Яны папоўнілі фонды абласной навуковай бібліятэкі імя Карскага, вышэйшай духоўнай семінарыі, трох універсітэтаў

абласнога цэнтра, музеяў гісторыка-археалагічнага і гісторыі рэлігіі. Таксама кнігі перададзены ва ўсе раённыя бібліятэкі, дзе з імі зможа азнаёміцца кожны жадаючы.

Выданне суправаджаецца навуковымі каментарамі, а арыгінальныя тэксты Скарыны перакладзены на сучасную беларускую мову, рускую і англійскую.